

Фотарэпартаж Супольная малітва за школьнікаў ды студэнтаў прайшла ў касцёле Святога Юды Тадэвуша ў вёсцы Лучай 1 верасня. Гэта ўжо чарговая адмысловая св. Імша, што ладзіцца ў Лучаі на пачатку навучальнага года. Пасля св. Імшы пробашч касцёла ксёндз Мікалай Ліпскі асвяціў школьныя прыналежнасці, якія прынеслі вучні з навакольных школаў. Пасля літургіі адбыўся ўжо традыцыйны для Лучая штомесячны канцэрт. Гэтым разам выступіць у касцёл прыехаў бард Аляксей Жбанаў – аўтар гімна вёскі Лучай. Гэты гімн быў ім упершыню выкананы ў касцёле роўна год таму. Аляксей Жбанаў праспяваў свае ўласныя песні, на вершы беларускіх класікаў.

Вельмі да месца тэмы вучобы былі і праспяваныя Аляксеем Жбанавым песні філаматаў ды філарэтаў. 200-гадовай даўнін, вершы студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, сярод якіх былі Адам Міцкевіч, Ян Чачот і Тамаш Зан, былі перакладзены бардам на беларускую мову, і сёння выконваюцца ў межах праекта «Песні філаматаў і філарэтаў».

Неад'емнай часткай такіх спеваў 200 гадоў таму было малако, якое пілі філаматы, а потым філарэты падчас падчас сваіх сходак. Частавалі малаком і гледачоў у Лучайскім касцёле.

Па словах ксяндза Мікалая Ліпскага, восень – таксама час святкавання 471-й гадавіны заснавання Лучая.

Упершыню ў летапісах Лучай згадваецца ў 1542 годзе. У розныя часы ім валодалі вядомыя шляхецкія роды. Росквіт мястэчка прыйшоўся на XVIII ст., калі ім валодалі Агінскія. У прыватнасці Альжбета Агінская-Пузыніна, мецэнатка і аматарка навук, пабудавала ў Лучаі 25-метровую вежу для астранамічных назіранняў. Таксама ёй быў закладзены барочны касцёл, які быў пабудаваны ўжо Тадэвушам Агінскім.

У XIX ст. у Лучаі збудавалі палац, у якім у міжваенны час месцілася польская дзяржаўная сельскагаспадарчая школа.

Сёння акрамя касцёла Св. Юды Тадэвуша, у Лучаі захавалася плебанія пачатку XIX ст., якая нядаўна была вернутая парафіянам.

Антон Трафімовіч